**Дзяржаўная ўстанова культуры**
**“Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі”**
**Каляндар знамянальных дат на 2024 год**

ЮБІЛЕІ
дзяржаўных і палітычных дзеячаў

**12 сакавіка** – **135 год** з дня нараджэння **Сташэўскага Аляксандра Іосіфавіча**, дзяржаўнага і палітычнага дзеяча Беларусі, былога народнага камісара ўнутраных спраў, народнага камісара юстыцыі Беларускай ССР, генеральнага пракурора рэспублікі, ураджэнца в. Думічы Бабаўнянскага сельскага Савета (12. 03. 1889 - 11. 12. 1938)

**31 снежня** – **120 год** з дня нараджэння **Варвашэні Івана Дзянісавіча**, партыйнага і дзяржаўнага дзеяча Беларусі, кіраўніка антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнца в. Быстрыца (31. 12. 1904 – 4.03.1957)

**2024**– **125 год** з дня нараджэння **Чарнушэвіча Аляксандра Анікеевіча**, дзяржаўнага і партыйнага дзеяча Беларусі, удзельніка партызанскага руху ў гады грамадзянскай вайны, наркома народнай асветы (1899 – 29. 10. 1937)

**2024** – **125 год** з дня нараджэння **Чарнушэвіча Аляксандра Мікалаевіча**, партыйнага і дзяржаўнага дзеяча Беларусі, ураджэнца г. Капыля (1899 – 2. 08. 1938)

ЮБІЛЕІ
военачальнікаў, герояў і ўдзельнікаў
Вялікай Айчыннай вайны

**10 лютага** - **105 год** з дня нараджэння **Лушчыцкага Міхаіла Аляксеевіча**, генерал-маёра медыцынскай службы, савецкага і расійскага вучонага ў галіне ваенна-марской і шпітальнай хірургіі, ураджэнца в. Колаўка В. Раёўскага сельскага Савета (зараз Цімкавіцкага) (10. 02. 1919 – 10. 03. 1999)

**17 мая** - **80 год** з дня нараджэння **Іодкі Адама Адамавіча**, савецкага і расійскага военачальніка, генерал-маёра, ураджэнца вёскі Бор (17. 05. 1944 – 23. 10. 1996)

**21 чэрвеня** – **110 год** з дня нараджэння **Таўпекі Аляксандра Рыгоравіча,** Героя Савецкага Саюза, камандзіра мінамётнага разліку, які вызначыўся ў чэрвені 1944 года ў баях па прарыве абароны праціўніка на Карэльскім перашыйку, ураджэнца в. Доктаравічы (21.06 1914 – 21.06. 1944)

**2024** – **120 год** з дня нараджэння **Лобана Фёдара Макаравіча**, генерал-маёра авіяцыі, ураджэнца в. Кіявічы Блеўчыцкага сельскага Савета (1904 - ?)

**2024** – **110 год** з дня нараджэння **Чарных Георгія Васільевіча**, удзельніка вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, ураджэнца в. Савічы Браткаўскага сельскага Савета (зараз Цімкавіцкага) (1914 - 7 . 11. 1949)

ЮБІЛЕІ
Герояў Сацыялістычнай Працы
і перадавікоў сельскай гаспадаркі

**1 мая**- **100 год** з дня нараджэння **Сабалеўскага Антона Кузьміч**а, працаўніка сельскай гаспадаркі Казахстана, механізатара, камбайнера, Героя

Сацыялістычнай Працы, ураджэнца вёскі Вясёлае (1. 05. 1924-24. 01. 2019)

**28 чэрвеня –** **100 год** з дня нараджэння **Выскваркі Арсена Мікалаевіча**,былога механізатара калгаса імя Ціміразева, Героя Сацыялістычнай Працы, ураджэнца в. Блеўчыцы (28.04. 1924 – 1989)

**10 кастрычніка – 110 год** з дня нараджэння **Трыгубовіч Алімпіяды Адамаўны,** былой свінаркі саўгаса "Крыніца", Героя Сацыялістычнай Працы, ураджэнкі в. Астрэйкі Сл. Кучынскага сельскага Савета (10. 10. 1914 – 13.04.1993)

**15 кастрычніка- 100 год** з дня нараджэння **Нахмановіча Аляксандра Львовіча,** казахскага спецыяліста і кіраўніка сельскай гаспадаркі, заснавальніка шэрагу аграрных вытворчасцей, Героя Сацыялістычнай Працы, ураджэнца вёскі Вясёлае (15. 10. 1924 -14. 05. 1996)

**2024** – **115 год** з дня нараджэння **Рачок Соф'і Пятроўны**, брыгадзіра першай ў рэспубліцы жаночай трактарнай брыгады, ураджэнкі в. Печураны Пацейкаўскага сельскага Савета (1909 -1970)

## ЮБІЛЕІ
навуковых дзеячаў

**7 студзеня- 75 год** з дня нараджэння **Корсакава Уладзіміра Уладзіміравіча**, беларускага канструктара і вучонага ў галіне машынабудавання, з 1996 года быў канструктарам, а затым галоўным канструктарам Дзяржаўнага прадпрыемства "Мінскі аўтамабільны завод" ВА "Белаўтамаз", ураджэнца г. Капыля (7. 01. 1949)

**10 сакавіка- 95 год** з дня нараджэння **Наркевіча Аркадзя Іосіфавіча**, доктара філалагічных навук, прафесара, спецыяліста ў галіне марфалогіі і сінтаксісу беларусскай мовы, культуры мовы журналіста, ураджэнца в. Воранаўшчына Цімкавіцкага сельскага Савета (10.03.1929 – 13. 10 2002)

**1 мая - 90 год** з дня нараджэння **Бокуна Івана Антонавіча**, беларускага вучонага ў галіне цеплаэнэргетыкі, доктара тэхнічных навук прафесара, член-карэспандэнта Беларускай інжынернай акадэміі, ураджэнца вёскі Сцяпуры (1.05. 1934)

**23 мая - 85 год** з дня нараджэння **Зяневіча Міхаіла Вікенцьевіча**, расійскага вучонага ў галіне педыятрыі, пульманалогіі, педагога, доктара медыцынскіх навук, ураджэнца вёскі Дусаеўшчына (23. 05. 1939)

**20 жніўня - 85 год з** дня нараджэння **Гамзы Мікалая Аляксандравіча**, вучонага ў галіне спартыўнай медыцыны, ураджэнца вёскі Траянава (20. 08. 1939)

**8 верасня- 100 год** з дня нараджэння **Чыгіра Васіля Фёдаравіча**, заслужанага юрыста Беларусі, доктара юрыдычных навук, ураджэнца в. Лешня Блеўчыцкага сельскага Савета (8. 09. 1924)

**17 верасня - 80 год** з дня нараджэння **Калацкага Валерыя Іванавіча**, расійскага вучонага ў галіне акіяналогіі, прыкладной гідрафізікі і аховы навакольнага асяроддзя, доктара фізіка-матэматычных навук, ураджэнца вёскі Садавічы (17. 09. 1944 -19. 11. 1996)

**21 верасня- 125 год** з дня нараджэння **Кіені Макара Аляксандравіча**, інжынера-будаўніка мастоў у Еўропе і Амерыцы, ураджэнца в. Домантавічы Блеўчыцкага сельскага Савета, ён будаваў масты праз Прыпяць, Днепр, Волгу, Аку, чыгуначны мост у Днепрапятроўску ўзведзены пад яго кіраўніцтвам, з'яўляўся ўнікальным збудаваннем у свеце (21. 09. 1899 - 19. 04. 1939)

**27 верасня-** **130 год** з дня нараджэння **Гурло Аляксея Васільевіча**, першага рэктара Дзяржаўнага эканамічнага універсітэта, ураджэнца г. Капыля (27. 09. 1894 – 30.01.1960)

**27 верасня-** **90 гадоў** з дня нараджэння **Вараб'я Георгія Алясандравіча**, беларускага вучонага-юрыста, ураджэнца вёскі Быстрыца (23. 09. 1934 - 27. 08. 2012)

**28 верасня -** **60 год** з дня нараджэння **Лебедзева Мікалая Мікалаевіча,** ра сійскага вучонага ў галіне хірургіі, доктара медыцынскіх навук, дзіцячыя і юнацкія гады якога прайшлі ў Капылі (28. 09.1964)

**5 снежня-** **105 год** з дня нараджэння **Гурына Льва Сямёнавіча,** савецкага і расійскага вучонага ў галіне статыстычнай апрацоўкі касмічнай вымяральнай інфармацыі, ураджэнца вёскі Семежава (5. 12. 1919 – 26. 05. 2010)

**12 снежня -** **85 год** з дня нараджэння **Ордзіна Вілора Мікалаевіча,** прамыслоўца, вучонага ў галіне эканомікі, грамадскага і палітычнага дзеяча, ураджэнца вёскі Цімкавічы (12. 12. 1939)

**17 снежня -** **120 год** з дня нараджэння **Айзенберга Рыгора Захаравіча,** расійскага вучонвгв ў галіне электрадынамікі і сувязі, доктара тэхнічных навук, ураджэнца вёскі Цімкавічы (17. 12. 1904 -30. 03. 1994)

ЮБІЛЕІ

паэтаў, пісьменнікаў і дзеячаў мастацтва

**21 лютага -** **115 год** з дня нараджэння **Андруковіча Фёдара Аляксандравіча**, беларускага і расійскага опернага спевака (тэнара),былога саліста Малога опернага тэатра ў Санкт-Пецярбургу, ураджэнца вёскі Цімкавічы (21. 02. 1909 - 1. 03. 1964)

**23 лютага -** **145 год** з дня нараджэння **Малевіча Казіміра Севярынавіча**, расійскага, украінскага і беларускага мастака-авангардыста, тэарэтыка мастацтва, філосафа, педагога, дзіцячыя гады якога прайшлі на Капыльшчыне (23. 02. 1879 – 15. 05. 1935)

**6 красавіка-** **120 год** з дня нараджэння **Хведаровіча Міколы**,беларускага паэта, ураджэнца г. Капыля (6. 04.1904 - 20.08. 1991)

**24 мая-** **120 год** з дня нараджэння **Русака Адама Герасімавіча**, беларускага паэта, ураджэнца в. Пясочнае (24. 05.1904 – 21. 03.1987)

**19 верасня-** **90 год** з дня нараджэння **Галубовіча Генадзя Міхайлавіча**, графіка, члена Саюза мастакоў Беларусі, заслужанага работніка культуры Беларусі, ураджэнца в. Вялешына-1 (19. 09. 1934 - 24. 04. 1992)

**2 кастрычніка -** **125 год** з дня нараджэння **Бабарэкі Адама Антонавіча**, беларускага пісьменніка і крытыка, ураджэнца в. Сл. Кучынка (2. 10. 1899 – 10.10. 1938)

**21 лістапада-** **95 год** з дня нараджэння **Ралько Івана Дмітрыевіча**, крытыка і літаратуразнаўцы, ураджэнца в. Макраны (21.11. 1929 – 27.12. 1979)

**15 снежня-** **95 год** з дня нараджэння **Родчанкі Рыгора Віктаравіча**, паэта, публіцыста, фалькларыста і краязнаўцы, ураджэнца в. Цімкавічы (15.12. 1929 – 20. 02. 1995)

У **2024 годзе** спаўняецца:

**1 студзеня -** **45 год** з дня адкрыцця ў Капылі **гісторыка-краязнаўчага музея** (1. 01. 1979)

**красавік -** **105 год** як у Капылі была створана **першая ячэйка Камуністычнага саюза моладзі.** Сакратаром быў абраны Канстанцін Зарамбоўскі (красавік, 1919)

**15 красавіка** – **60 год** з дня заснавання саўгаса "Бабоўня" (15. 04. 1964)

**май -** **95 год** з дня заснавання **ААТ "Ціміразеўскі"** (калгас імя Ціміразева) (май, 1929)

**май -** **65 год** як ў Капылі было адчынена **аддзяленне хуткай дапамогі** пры раённай бальніцы (май, 1959)

**24 чэрвеня –** **60 год** з дня адкрыцця **літаратурнага музея імя Кузьмы Чорнага** ў Цімкавічах (24. 06. 1964)

**чэрвень -** **35 год** з дня ўтварэння **Капыльскага аддзялення "Ахова"**пры МУС Рэспублікі Беларусь (Чэрвень,1989)

**1 ліпеня –** **80 год** з дня **вызвалення Капыля** ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (1.07. 1944)

**4 ліпеня -** **45 год** з дня адкрыцця ў Капылі **гісторыка-краязнаўчага музея** (4. 07. 1979)

**16 ліпеня –** **70 год** як быў ўтвораны **Блеўчыцкі сельскі Савет (16. 07. 1954)**

**17 ліпеня** – **100 год** з дня **ўтварэння Капыльскага раёна** і як Капыль стаў раённым цэнтрам (17. 07. 1924)

**1 верасня** – **60 год** як пачала сваю работу **дзіцячая школа мастацтваў** г. Капыля (1. 09. 1964)

**1 верасня -** **15 год** як была адкрыта ўстанова **адукацыі "Капыльскі раённы Цэнтр дзіцячага турызму і краязнаўства**" (1.09. 2009)

**29 кастрычніка – 95** год з дня ўтварэння **ААТ "Семежава"** (калгас "Семежава") (29. 10. 1929)

**лістапад –** **95 год** здня ўтварэння **ААТ "Скабін"** (калгас "Рассвет") (лістапад, 1929)

**2024 –** **255 год** як у вёсцы Бабоўня была заснавана **суконная мануфактура (**1769)

**2024–** **115 год** як вёсцы Садавічы было адчынена **народнае вучылішча (**1909)

**2024 –** **85 год** як была завершана пабудова **новай, шырокай чыгункі "Баранавічы – Цімкавічы" (1939)**

**2024 -** **95 год** як было арганізавана **ЗАТ "Жыліхава"** (калгас "Бальшавік) (1929)

Пры складанні спіса "Старонкі гісторыі Капыльшчыны" былі выкарыстаны наступныя матэрыялы:


1. Беларуская энцыклапедыя: У18 т. – Мінск.: БелЭн, 1996. – 2002
2. Беларусь: энцыкл. даведнік. – Мінск: БелЭн, 1995.- 799 с.
3. Бельскі, А. Тут жыцця пачатак: вядомыя людзі з Капыльшчыны /Алесь Бельскі. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2021. – 127 с.
4. Бельскі, А. Тут іх карані і вытокі: вядомыя людзі з Капыльшчыны ў свеце.- Мінск: Рэдакцыя часопіса "Роднае слова", 2014..- 71 с.
5. Бельскі, А. Тут наша радзіма: вядомыя людзі з Капыльшчыны ў Беларусі і свеце /Алесь Бельскі. – Мінск:Выдавец Зміцер Колас, 2018. -152 с.
6. Минская область: энциклопедия в 2 т.- Мінск: БелЭн, 2007
7. Памяць:Капыльскі раён: гісторыка-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск: Бел навука, 2001. - 638 с.
8. Звесткі з установы "Дзяржаўны занальны архіў" г. Слуцк

*Каляндар складзены метадыстам аддзела бібліятэчнага маркетынгу*
*Н. А. Гурло*